Склад сельскага насельніцтва Заходняй Беларусі ў пачатку 1930-х гг.




У пошуках заробкаў, даведзеныя голадам і прыгнётам да адчаю, сяляне шукалі выйсце ў эміграцыі. У 1925—1938 гг. з трох ваяводстваў Заходняй Беларусі на пастаяннае жыхарства ў ЗША, Канаду, Лацінскую Амерыку, Заходнюю Еўропу і іншыя краіны выехалі больш за 78 тыс. чалавек.

**1.** Сфармулюйце прычыны ўвядзення палітыкі «ваеннага камунізму». Дайце вызначэнне дадзенаму паняццю.
**2.** У чым заключалася роля новай эканамічнай палітыкі ў аднаўленні гаспадаркі БССР? Якія яе механізмы вы лічыце найбольш эфектыўнымі? Як вы думаеце, чаму нэп стаў усяго толькі часовай мерай у палітыцы бальшавікоў? Свой пункт гледжання абгрунтуйце.
**3.** Чым тлумачыліся асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР?
**4.** Растлумачце ўзаемасувязь індустрыялізацыі і калектывізацыі. Якія палітычныя, эканамічныя і тэхнічныя задачы былі вырашаны з іх дапамогай, а якія не былі дасягнуты? Як вы думаеце, чаму?
**5.** Параўнайце сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР і Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Зрабіце вывад.

# § 11. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1940-х — 1980-я гг.

§ 11-1

§ 11-2

§ 11-3

Якімі былі асаблівасці і вынікі правядзення індустрыялізацыі ў БССР?

**Курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці.** Характэрнай рысай першай пасляваеннай пяцігодкі (1946—1950 гг.) было не толькі аднаўленне разбуранай эканомікі, але і апераджальны рост цяжкай прамысловасці — машынабудавання, металаапрацоўкі, электраэнергетыкі, паліўнай прамысловасці, будаўнічых матэрыялаў. Развіццё цяжкай прамысловасці ў БССР забяспечвалася пераважна за кошт сродкаў бюджэту СССР. У рэспубліцы з'явіўся шэраг новых галін прамысловасці: аўтамабільная, трактарная, дарожных машын і будаўнічых механізмаў.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Восенню 1950 г. МТЗ пачаў серыйны выпуск гусенічных трактараў «Кіравец Д-35». Першыя колавыя трактары «Беларусь» былі выпушчаны ў 1953 г.

У 1946 г. пачалося будаўніцтва Мінскага трактарнага завода (МТЗ). У 1947 г. сваю прадукцыю прадставілі веласіпедны і інструментальны заводы ў Мінску, лакамабільны завод і металаапрацоўчы камбінат у Магілёве, завод «Рухавік рэвалюцыі» ў Гомелі. Пачала працаваць БелГРЭС.

**Тэмпы росту валавой прадукцыі прамысловасці БССР у 1945–1950 гг. (у % да 1940 г.)**

| Галіны прамысловасці | 1945 г. | 1950 г. |
|---|---|---|
| паліўная | 19 | 91 |
| вытворчасць электраэнергіі і цеплаэнергіі | 20 | 153 |
| хімічная і гумова-асбеставая | 5 | 198 |
| машынабудаванне і металаапрацоўка | 45 | 237 |
| лясная, папяровая і дрэваапрацоўчая | 23 | 89 |
| лёгкая | 10 | 74 |
| харчовая | 19 | 85 |
| Усяго: | 20 | 115 |

*На аснове звестак з табліцы вызначце прыярытэты эканамічнага развіцця БССР у пасляваенны перыяд. Якія змены адбыліся ў структуры прамысловай вытворчасці ў пасляваенныя гады?*



Пачынаючы з сярэдзіны 1950-х гг. прамысловае будаўніцтва ў рэспубліцы ажыццяўлялася ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (НТР). НТР прадугледжвала хуткае ўкараненне дасягненняў навукі ў вытворчы працэс.

У 1958 г. першы экзэмпляр 40-тоннага самазвала быў удастоены Гран-пры на Сусветнай выставе ў Брусселі


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг. у БССР быў пабудаваны шэраг прадпрыемстваў, заснаваных на перадавых тэхналогіях таго часу.

**Прадпрыемствы, пабудаваныя ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг.**

- Магілёўскі металургічны завод
- Мінскі аўтамабільны завод
- Беларускі аўтазавод (БелАЗ) у г. Жодзіна
- Бярозаўская ГРЭС
- Мінскі падшыпнікавы і гадзіннікавы заводы
- Мінскі завод ацяпляльнага абсталявання

Для эканамічнага развіцця Беларусі ў 1970-я гг. быў характэрны, як і ў папярэднія гады, пераважна хуткі рост цяжкай прамысловасці. Яна ператваралася ў важнейшую галіну вытворчасці, у тым ліку для абслугоўвання ваенна-прамысловага комплексу.

**Развіццё радыётэхнічнай, радыёэлектроннай, хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці, машынабудавання і металаапрацоўкі.** У сярэдзіне 1960-х гг. у СССР была зроблена спроба рэфармавання кіравання эканомікай. Прынятыя меры былі прагрэсіўнымі, таму што павялічвалася значнасць гасразліковых стымулаў, пашыраліся правы прадпрыемстваў, іх самастойнасць, павялічваліся капіталаўкладанні ў прамысловасць.

У 1954 г. на Мінскім прыборабудаўнічым заводзе імя Леніна з'явіліся першыя беларускія тэлевізары — «Беларусь». У гады восьмай пяцігодкі (1966–1970) пачалі працаваць вытворча-тэхнічнае прадпрыемства «Гарызонт», на базе Мінскага механічнага завода — Беларускае оптыка-механічнае аб'яднанне, а таксама буйнейшае прадпрыемства Усходняй Еўропы — навукова-вытворчае аб'яднанне «Інтэграл» (Мінскае вытворчае аб'яднанне вылічальнай тэхнікі) і інш.

У 1958 г. на Мінскім заводзе ЭВМ імя Р. К. Арджанікідзэ было арганізавана спецыяльнае канструктарскае бюро для суправаджэння ў вытворчасці і мадэрнізацыі ЭВМ, якія выпускаліся заводам.

*Аб чым сведчыў факт выпуску электронна-вылічальных машын у БССР?*



ЭВМ «Мінск-1» у першай палове 1960-х гг. – лідзіруючы тып серыйных лямпавых машын такога тыпу ў СССР

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У 1964 г. у Беларусі было адкрыта радовішча нафты «Рэчыцкае». Яно зрабіла станоўчы ўплыў на развіццё паліўна-энергетычнай прамысловасці.



Важным кірункам развіцця эканомікі ў гэты перыяд стала развіццё хімічнай прамысловасці. Было пабудавана некалькі калійных камбінатаў, пазней аб’яднаных у вытворчае аб’яднанне «Беларуськалій».

У гэты ж час была створана і нафтаперапрацоўчая прамысловасць Беларусі. У 1963 г. увайшла ў строй першая чарга Полацкага, а ў 1971 г. Мазырскага нафтаперапрацоўчых заводаў.

Высокімі тэмпамі развіваліся машынабудаванне і металаапрацоўка. Павялічвалася вытворчасць грузавых аўтамабіляў і трактараў, сельскагаспадарчых машын. У 1958 г. на Беларускім аўтамабільным заводзе (БелАЗ) у Жодзіне пачаўся выпуск кар’ерных самазвалаў.

*Складзіце топ-5 дасягненняў індустрыяльнага развіцця БССР у 1946—1980-я гг. Абмяркуйце, якія фактары абумовілі дасягненні БССР у гэтай сферы ва ўказаны перыяд.*

Вынікам развіцця эканомікі БССР да сярэдзіны 1980-х гг. стала стварэнне буйнога тэрытарыяльна-галіновага прамысловага комплексу.

У той жа час у сярэдзіне 1980-х гг. наспявалі крызісныя з’явы ў эканоміцы. Партыйнай наменклатурай пры прыняцці рашэнняў не заўсёды ўлічваліся законы развіцця эканомікі. Станавілася відавочнай неабходнасць карэнных пераўтварэнняў у эканамічнай сферы.

**Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі і стан аграпрамысловага комплексу.** За гады чацвёртай пяцігодкі (1946—1950 гг.) сельская гаспадарка была ў значнай ступені адноўлена. Тым не менш у канцы 1950-х — пачатку 1960-х гг. сітуацыя ў сельскай гаспадарцы зноў пагоршылася. Большасць калгасаў былі нерэнтабельнымі і затратнымі. Назіралася зніжэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчай прадукцыі, павелічэнне яе сабекошту. Адмоўна адбіваўся нізкі ўзровень кіравання галіной, падрыхтоўкі сельскагаспадарчых кадраў, агранамічнай навукі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У сакавіку 1965 г. Пленум ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб неадкладных мерах па далейшым развіцці сельскай гаспадаркі СССР». Была пастаўлена задача ўзняць калгасную і саўгасную вытворчасць на больш высокі ўзровень. Для гэтага абвяшчаўся курс на **інтэнсіўны шлях развіцця** (інтэнсіфікацыю).

*Выкарыстоўваючы мясцовыя СМІ, кнігу «Памяць», даведайцеся, як рэалізоўваліся прадугледжаныя рэформай 1965 г. кірункі інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі ў вашым рэгіёне.*

**Рэформа сельскай гаспадаркі 1965 г.**

| Асноўныя кірункі інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі | Меры па ліквідацыі адставання ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці |
|---|---|
| • механізацыя і электрыфікацыя;<br>• спецыялізацыя сельскагаспадарчых прадпрыемстваў;<br>• хімізацыя, меліярацыя і выкарыстанне новых тэхналогій апрацоўкі глебы | • павелічэнне закупачных цэн;<br>• адмена абмежаванняў на ўтрыманне жывёлы ў дапаможных гаспадарках;<br>• павелічэнне асігнаванняў у сельскую гаспадарку |

Рэформа першапачаткова дала станоўчыя вынікі. У гады восьмай пяцігодкі (1966—1970 гг.) прырост валавой прадукцыі склаў 18 %. Павышалася культура земляробства. У калгасах і саўгасах павялічылася колькасць механічных установак і прыстасаванняў, якія павышалі прадукцыйнасць і аблягчалі ўмовы працы.



Пасадка бульбы ўручную. Беларуская дзяржаўная селекцыйная станцыя «Заазер'е». 1956 г.



Пасадка бульбы ў калгасе «Камінтэрн» Магілёўскай вобласці. 1980-я гг.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Аднак ужо ў наступных пяцігодках аб'ём валавой прадукцыі ў сельскай гаспадарцы зноў знізіўся. Прычынамі гэтага былі адміністрацыйна-камандная сістэма з яе неэфектыўным выкарыстаннем капітальных укладанняў, дыспрапорцыі ў коштах на тэхніку і прадукцыю сельгасвытворчасці, незацікаўленасць работнікаў калгасаў у выніках сваёй працы, адсутнасць ініцыятывы. З сярэдзіны 1960-х гг. павялічылася міграцыя насельніцтва з вёскі ў горад.

*Чым, на ваш погляд, была абумоўлена міграцыя насельніцтва ўнутры рэспублікі?*

Чарговая спроба палепшыць кіраванне сельскай гаспадаркай была зроблена ў маі 1982 г. Згодна з рашэннем Пленума ЦК КПСС была прынята Харчовая праграма СССР на перыяд да 1990 г. Праграмай былі прадугледжаны стварэнне ў СССР аграпрамысловага комплексу (АПК), далейшая механізацыя і хімізацыя сельскай гаспадаркі, паляпшэнне кармавой базы, выкарыстанне новых прагрэсіўных тэхналогій.

У 1985 г. на тэрыторыі Беларусі быў створаны рэгіянальны АПК — «Белаграпрам». Яго задачай было аб'яднанне ў адзіную структуру галін народнай гаспадаркі, накіраваных на вытворчасць, перапрацоўку сельскагаспадарчай сыравіны і атрыманне з яе прадукцыі, якая даводзілася б да спажыўца.

У гэтыя гады ў рэспубліцы шырока разгарнуліся меліярацыйныя работы. Значна павялічыліся аб'ёмы ўнясення ў глебу арганічных і асабліва мінеральных угнаенняў.

Нягледзячы на пэўныя поспехі, дасягнутыя за 1970–1985 гг., у СССР і БССР у гэты перыяд назіралася ўстойлівая тэндэнцыя зніжэння тэмпаў эканамічнага росту. Гэта сведчыла аб нарастанні крызісных з'яў у эканоміцы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Агітацыйны плакат Харчовай праграмы СССР




*Суаднясіце змест плаката і задачы, якія стаялі перад «Белаграпрамам». Які кампанент аграпрамысловага комплексу не знайшоў адлюстравання на плакаце?*

**Сярэднегадавыя тэмпы эканамічнага росту ў СССР і БССР у 1970–1985 гг. (у %)**

| | | 1970–1975 гг. | 1976–1980 гг. | 1981–1985 гг. |
|---|---|---|---|---|
| 1. ВНП (валавы нацыянальны прадукт) | СССР<br>БССР | 6,3<br>8,3 | 4,2<br>5,5 | 3,5<br>5,0 |
| 2. Прамысловая прадукцыя | СССР<br>БССР | 7,4<br>10,4 | 4,4<br>7,2 | 3,7<br>5,4 |
| 3. Прадукцыя сельскай гаспадаркі | СССР<br>БССР | 2,5<br>2,6 | 1,7<br>1,5 | 1,1<br>1,6 |

*Чым, па вашым меркаванні, тлумачыцца замаруджванне тэмпаў эканамічнага росту БССР у 1970—1985 гг.?*

**Пераадоленне наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.** Невымерную шкоду нанесла рэспубліцы самая буйная ў гісторыі чалавецтва тэхнагенная катастрофа — аварыя на Чарнобыльскай АЭС (ЧАЭС) 26 красавіка 1986 г. Пад радыеактыўнае забруджванне трапілі многія раёны Гомельскай і Магілёўскай, частка Гродзенскай, Брэсцкай і Мінскай абласцей. Высокі ўзровень радыяцыі

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

> 23 % тэрыторыі Беларусі аказаліся радыеактыўна забруджанымі. У зоне забруджвання пражывала пятая частка насельніцтва рэспублікі — каля 2,1 млн чалавек. З гаспадарчага абароту было выведзена больш за 20 % сельскагаспадарчых угоддзяў, амаль 15 % лясоў.
>
> *Народны пісьменнік Беларусі*
> *І. Г. Чыгрынаў*

назіраўся амаль ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, у некаторых раёнах ён быў у некалькі тысяч разоў вышэй за натуральны радыяцыйны фон.

Дзяржава пастаянна вядзе працу па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы. На пераадоленне наступстваў катастрофы выдаткоўваюцца вялізныя сумы: агульны аб'ём фінансавання з 1990 па 2020 г. склаў у эквіваленце больш за 19 млрд долараў. З іх 9 млрд было патрачана на сацыяльную абарону насельніцтва, каля 8 млрд — на сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых рэгіёнаў.

Беларусь затрачвае на пераадоленне наступстваў аварыі на ЧАЭС 3 % гадавога бюджэту. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь прадугледжаны шэраг важных мерапрыемстваў па сацыяльнай абароне, медыцынскім забеспячэнні, санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні пацярпелага насельніцтва. У рамках праграмы на 2016—2020 гг. на пераадоленне наступстваў катастрофы запланаваны расходы ў 2,51 млрд рублёў, з іх 1,438 млрд — на сацыяльную абарону, медыцынскае забеспячэнне пацярпелых.

1. Чаму пасля Вялікай Айчыннай вайны ў БССР быў прыняты курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці? У чым гэта знайшло адлюстраванне? Канкрэтызуйце свой адказ фактамі.
2. Якія новыя галіны прамысловасці з'явіліся ў БССР ва ўмовах НТР?
3. Якія кампаненты ўключаў у сябе аграпрамысловы комплекс вашага рэгіёну?
4. Падрыхтуйце паведамленне аб эканамічным развіцці вашага рэгіёну ў 1946—1980-я гг. Якім чынам тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця, апісаныя ў тэксце параграфа, праявіліся ў развіцці вашага рэгіёну?
5. Як вы думаеце, чаму, нягледзячы на праведзеныя рэформы, крызісныя з'явы ў эканоміцы БССР да канца 1980-х гг. узмацніліся?
6. Якімі вынікамі эканамічнага развіцця БССР у 1946—1980-я гг. могуць ганарыцца сучасныя беларусы?


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ